**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЕ АБ’ЯДНАННЕ ПА ГУМАНІТАРНАЙ АДУКАЦЫІ**

**ЗАЦВЕРДЖАНА**
**Першы намеснік Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь**
**_____________________І.А. Старавойтава**
**_____________________**
**Рэгістрацыйны № ТД_____/ тып.**

# ГІСТОРЫЯ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВА БЕЛАРУСІ

## Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:
## 1-24 01 02 “Правазнаўства”
## 1-24 01 03 “Эканамічнае права”
## 1-24 01 01 “Міжнароднае права”

**УЗГОДНЕНА**
**Намеснік Міністра юстыцыі Рэспублікі Беларусь**
**__________________________С.У. Задзіран**
**__________________________**

**УЗГОДНЕНА**
**Начальнік Галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**
**________________________С.А. Каспяровіч**
**________________________**

**Старшыня вучэбна-метадычнага аб’яднання па гуманітарнай адукацыі**
**________________________С.М. Ходзін**
**________________________**

**Прарэктар па навукова-метадычнай рабоце Дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы»**
**____________________________І.У. Цітовіч**
**____________________________**

**Эксперт – нормакантралер**

**____________________________**
**____________________________**

**МІНСК 2018**

**Складальнікі:**

**Т.І. Доўнар** прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар юрыдычных навук, прафесар;

**С.А. Калінін** загадчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт;

**Л.Л. Голубева** дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт;

**А.Я. Ляскоў** дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат юрыдычных навук

**А.І. Арлоўская** дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт;

**Рэцэнзенты:**

кафедра тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь

**А.Ф. Вішнеўскі**– прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права ўстановы адукацыі “Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь”, доктар гістарычных навук, прафесар права

**Рекамендавана да зацвярджэння ў якасці тыпавой:**

кафедрай тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 4 ад 23.11.2017 г.)

навукова-метадычным Саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 2 ад 15.11.2017 г.)

навукова-метадычным саветам па групе спецыяльнасцей “Права” Вучэбна-метадычнага аб’яднання па гуманітарнай адукацыі (пратакол № 3 ад 26.12.2017 г.)

**Адказны за рэдакцыю: Л.Л. Голубева**

**Адказны за выпуск: Л.Л. Голубева**

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Беларуская дзяржаўнасць, якая прайшла шматвяковы шлях гістарычнага развіцця, у сувязі з заканамернасцямі гістарычнага працэсу і прынцыпам пераемнасці ў сучасны перыяд актыўна развіваецца па шляху пабудовы дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы. Гэтаму працэсу спрыяе вывучэнне гісторыі дзяржавы і права Беларусі – адной з фундаментальных прававых дысцыплін, прадугледжаных вучэбнымі планамі па спецыяльнасцях, якія адносяцца да накірунку адукацыі "Права", прадметам вывучэння якой з'яўляецца сістэма ведаў аб прычынах узнікнення і станаўлення беларускай дзяржаўнасці, характэрных рысах, асаблівасцях і тэндэнцыях на шляху яе паэтапнага развіцця.

Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў якасці гістарычнай навукі ўяўляе сабой частку гісторыі чалавецтва, а ў якасці юрыдычнай – адну з важнейшых галін ведаў, на якіх грунтуюцца дасягненні юрыспрудэнцыі ў цэлым. Гістарычныя трансфармацыі дзяржаўна-прававой сферы патрабуюць, з мэтай прагназіравання перспектыў далейшага развіцця навуковага аналізу папярэдняга хода гістарычнага працэсу і пераасэнсоўвання папярэдніх навуковых падыходаў адносна такіх важнейшых палітычных інстытутаў як права і дзяржава. Як гісторыка-прававая дысцыпліна, гісторыя дзяржавы і права Беларусі мае не толькі пазнавальнае, але метадалагічнае і практычнае значэнне, бо дапамагае выпрацаваць у студэнтаў погляд на дзяржаўнасць як на дынамічны арганізм, які пастаянна развіваецца ва ўзаемасувязі з рэальным грамадска-палітычным становішчам. Без грунтоўнага ведання і яснага разумення сутнасці папярэдніх гістарычных падзей, характэрных рысаў сацыяльна-эканамічнага, палітыка-культурнага і прававога жыцця народа і тых змяненняў, якія адбываліся ў сувязі з развіццём і ўскладненнем гістарычнага працэсу, немагчыма мець цвёрды светапогляд і бачыць перспектывы будучыні.

Узнікненне, станаўленне, развіццё дзяржавы і права Беларусі, пачынаючы ад ранніх, простых формаў грамадскіх адносінаў да больш арганізаваных і складаных формаў дзяржаўнасці, адбывалася ў рэчышчы агульнай гісторыі чалавецтва і цесным культурным, эканамічным і палітычным узаемадзеянні з суседнімі народамі. Пройдзены гістарычны шлях беларускага народа сведчыць аб тым, што эвалюцыя дзяржаўнасці Беларусі, змяненне айчыннай дзяржаўна-прававой сферы адбываліся ў кантэксце агульных гістарычных тэндэнцый еўрапейскай гісторыі па складанаму шляху паступальнага і больш прагрэсіўнага развіцця. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што на працягу стагоддзяў змянялася назва беларускага народа, у сувязі з чым яго гісторыя часам прыпісвалася іншым народам і адвольна трактавалася, а некаторыя гістарычныя пытанні застаюцца яшчэ мала даследаванымі.

У паэтапным развіцці беларускай дзяржаўнасці і эвалюцыі прававой сферы найбольш характэрнымі з'яўляюцца наступныя перыяды: існаванне старажытных дзяржаў-княстваў у Беларусі; перыяд Вялікага Княства Літоўскага, дзяржавы, палітыка-эканамічным цэнтрам якой былі беларускія землі; перыяд Рэчы Паспалітай – канфедыратыўнай дзяржавы ў складзе Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага; знаходжанне беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі, а затым – у складзе РСФСР; перыяд узнаўлення беларускай дзяржаўнасці (абвяшчэнне БНР і БССР); савецкі перыяд (Беларуская ССР у складзе СССР); найноўшы перыяд, які пачаўся з абвяшчэння ў 1990 г. Дэкларацыі аб суверэнітэце БССР і заканадаўчага замацавання ў 1991 г. новай назвы беларускай дзяржаўнасці – Рэспубліка Беларусь. Зразумела, што гэта перыядызацыя некалькі ўмоўная. Маючы на ўвазе

неаднастайнасць і своеасаблівасць гістарычных перыядаў эвалюцыі дзяржавы і права Беларусі, з мэтай арыентацыі студэнтаў на важнейшыя этапы і падзеі грамадска-палітычнага развіцця ў іх храналагічнай паслядоўнасці ў праграму ўводзіцца характэрная перыядызацыя гісторыі дзяржавы і права Беларусі, якая найбольш значна адлюстроўвае асаблівасці генэзісу беларускай дзяржаўнасці. У адпаведнасці з важнейшымі эвалюцыямі прававой сферы ў праграме вылучаецца шэраг спецыяльных тэмаў.

Мэтай вучэбнай дысцыпліны з’яўляецца выпрацоўка разумення сутнасці гістарычных працэсаў, навыкаў усведамлення галоўных грамадскіх падзей, якія на іх уплывалі, выяўленне важнейшых тэндэнцый і заканамернасцяў гістарычнага развіцця, асэнсаванне адметнасці эвалюцыі нацыянальнай дзяржаўнасці і бачанне перспектыў яе будучыні. На падставе сістэмнага вывучэння помнікаў права студэнты змогуць набыць навыкі аналізу гістарычнага нарматыўнага прававога матэрыялу, што дапаможа ім пры засваенні курсаў галіновых юрыдычных дысцыплін вылучаць станоўчыя рысы і добрую вартасць сучаснага заканадаўства, а таксама выяўляць яго недахопы. Такім чынам, усведамленне гісторыі айчыннай прававой сферы мае і практычныя мэты – развіццё ў перспектыве яшчэ больш дасканалага нацыянальнага заканадаўства, найболей адэкватнага сучаснай прававой свядомасці грамадства.

Задачамі вучэбнай дысцыпліны з'яўляецца забеспячэнне сістэмнага засваення курса і сфармуляванне дакладных уяўленняў аб храналагічнай паслядоўнасці і этапах развіцця беларускай дзяржаўнасці, сутнасці важнейшых гістарычных падзей; асаблівасцях у развіцці права і функцыянаванні дзяржаўных органаў улады, судовых устаноў і заканадаўства на важнейшых этапах гістарычнага развіцця; развіццё юрыдычнага мыслення студэнтаў, у тым ліку – прывіццё навыкаў умелай арыентацыі ў прычынах, гістарычных умовах і асаблівасцях эвалюцыі беларускай дзяржаўнасці. Абавязковым для студэнтаў-правазнаўцаў з’яўляецца вывучэнне прававой спадчыны беларускага народа і засваенне катэгарыяльных паняццяў і канцэпцый, распрацаваных гісторыка-прававой навукай, што служыць метадалагічнай базай для паспяховага засваення галіновых і спецыяльных юрыдычных дысцыплін.

У мэтах рэалізацыі асноўных задач дысцыпліны мэтазгодна выкарыстоўваць наступныя тэхналогіі і метады навучання: тэхналогіі праблемна-модульнага навучання, тэхналогіі праектнага навучання, камунікатыўныя тэхналогіі, метад канкрэтных сітуацый. Для кіравання навучальным працэсам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавую сістэму ацэньвання вучэбнай дзейнасці студэнтаў, вучэбна-метадычныя комплексы, варыятыўныя мадэлі кіравання самастойнай працай студэнтаў.

Згодна з адукацыйнымі стандартамі вышэйшай адукацыі дадзеных спецыяльнасцей павінны быць сфарміраваны наступныя кампетэнцыі:

**акадэмічныя кампетэнцыі спецыяліста:**

- умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэрэтычных і практычных задач;
- валодаць сістэмным і параўнальным аналізам;
- валодаць даследчыцкімі здольнасцямі;
- умець працаваць самастойна;
- быць здольным выпрацоўваць новыя ідэі (крэатыўнасць);
- валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем;

- мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў, кіраваннем інфармацыяй і работай з камп'ютэрам;
- умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця;

**сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі спецыяліста:**

- валодаць якасцямі грмадзянскасці;
- быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння;
- валодаць здольнасцю да міжасабовых камунікацый;
- быць здольным да крытыкі і самакрытыкі;
- умець працаваць у камандзе;
- выконваць патрабаванні прававых актаў у прафесійнай і іншых сферах сваёй жыццядзейнасці;
- выконваць правілы прафесійнай этыкі;

**прафесійныя кампетэнцыі спецыяліста:**

- абараняць гарантаваныя Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і іншымі заканадаўчымі актамі асабістыя правы і свабоды, сацыяльна-эканамічныя і палітычныя правы грамадзян, канстытуцыйны лад Рэспублікі Беларусь, дзяржаўныя і грамадскія інтарэсы;
- выкладаць юрыдычныя і эканамічныя дысцыпліны на сучасным навукова-тэарэтычным і метадычным узроўнях ва ўстановах агульнай сярэдняй і сярэдняй спецыяльнай адукацыі;
- ажыццяўляць прававую і эканамічную адукацыю;
- валодаць метадамі прававой кваліфікацыі фактаў;
- самастойна ажыццяўляць збор і аналіз нарматыўнай і фактычнай інфармацыі па пытаннях дзейнасці міжнародных арганізацый, дзяржаўных органаў і арганізацый у Рэспубліцы Беларусь і замежных дзяржавах;
- знаць і выкарыстоўваць прававую тэрміналогію, валодаць асновамі прамоўніцкага майстэрства;
- знаць асаблівасці прававога рэгулявання функцыяніравання інтэграцыйных аб'яднанняў, міжнародных арганізацый, а таксама ўдзелу суб'ектаў дзяржаў-членаў у трансгранічных адносінах, уключаючы ажыццяўленне дзейнасці на тэрыторыях са спецыяльнымі рэжымамі;
- ажыццяўляць фундаментальныя, прыкладныя і міждысцыплінарныя даследаванні ў галіне юрыдычных навук;
- праводзіць прававы аналіз актуальных праблем міжнароднага публічнага і міжнароднага прыватнага права;
- валодаць метадамі даследавання нацыянальна-прававых і міжнародна-прававых праблем, збора і аналіза тэарэтычнай інфармацыі, аналіза і абагульнення правапрымяняльнай практыкі;
- весці пошук прававой інфармацыі, выбіраць крыніцы і каналы атрымання інфармацыі, вызначаць рэгламент збору інфармацыі, забяспечваць дакладнасць, надзейнасць і рэлевантнасць інфармацыі;
- сістэматызаваць і абагульняць прававую інфармацыю;
- мадэліраваць сітуацыі міжнародных адносін, прагназіраваць магчымыя наступствы падзей;
- праводзіць бібліяграфічную работу з выкарыстаннем сучасных інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій;
- рыхтаваць даклады, матэрыялы да канферэнцый і семінараў, прэзентацыі;
- праводзіць вучэбныя і метадычныя заняткі (лекцыі, семінары, дзелавыя

гульні, вучэбныя экскурсіі і інш.);

- забяспечваць кіраўніцтва рэфератамі, курсавымі работамі, вучэбнай і вытворчай практыкай;
- ажыццяўляць кіраўніцтва самастойнай работай навучэнцаў;
- праводзіць паточны, модульны, выніковы кантроль якасці падрыхтоўкі спецыялістаў;
- выкарыстоўваць дыферынцыраваныя формы, метады, сродкі навучання і выхавання розных катэгорый навучэнцаў;
- распрацоўваць вучэбна-метадычную дакументацыю;
- планаваць і кіраваць вучэбна-пазнавальнай, навукова-даследчай і іншымі відамі дзейнасці навучэнцаў;
- фарміраваць навыкі самастойнай работы з вучэбнай, даведачнай, навуковай літаратурай, глабальнымі інфармацыйнымі рэсурсамі і дыстанцыйнымі адукацыйнымі сеткамі;
- рэгуляваць працоўныя і міжасабовыя адносіны і ўзаемадзеянні ў педагагічных калектывах;
- праводзіць псіхолага-педагагічныя і сацыялагічныя даследаванні, распрацоўваць і рэалізоўваць мерапрыемствы па забеспячэнню здаровага маральна-псіхалагічнага клімату ў калектыве;
- умець складаць дагаворы, прававыя дакументы, іншыя матэрыялы ў электроннай форме.

На падставе засваення вучэбнага матэрыялу студэнты павінны:

**ведаць**:

- канцэптуальныя асновы і храналагічную паслядоўнасць развіцця беларускай дзяржаўнасці і прававой сістэмы;
- асноўныя этапы станаўлення дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі, беларускай дзяржаўнасці, дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь;
- помнікі права, дасягненні прававой культуры Беларусі, эвалюцыю важнейшых прававых інстытутаў і галін права;
- асаблівасці гістарычнага развіцця дзяржаўных органаў, судовай сістэмы, заканадаўства Беларусі;
- канцэптуальныя асновы гісторыі дзяржавы і права Беларусі;
- асноўныя этапы і храналагічную паслядоўнасць развіцця беларускай дзяржаўнасці;
- асноўныя катэгорыі, паняцці і дасягненні, характарызуючыя ўзровень гістарычнага развіцця прававой культуры Беларусі;
- прававыя крыніцы, асаблівасці функцыяніравання і гістарычнага развіцця дзяржаўных органаў і заканадаўства;
- эвалюцыю прававога становішча насельніцтва;
- характэрныя рысы і асаблівасці гістарычнага развіцця важнейшых прававых інстытутаў і галін права;

**умець:**

- выяўляць заканамернасці і асаблівасці эвалюцыі прававых інстытутаў, галін права, заканадаўства Беларусі;
- прымяняць фармацыйны і цывілізацыйны падыходы пры характарыстыцы заканамернасцей і асаблівасцей гістарычнага развіцця беларускага социума;

- тлумачыць уплыў усходнеславянскага (праваслаўнага, расійскага) і заходнееўрапейскага (каталіцкага) культурна-цывілізацыйных фактараў на дзяржаўна-палітычнае развіццё Беларусі ў розныя гістарычныя перыяды;

- ажыццяўляць параўнальны аналіз прававых рэформ у працэсе мадэрнізацыі беларускага грамадства;

- аналізаваць працэс станаўлення беларускай дзяржаўнасці, афармленне і ўмацаванне суверэнітэту Рэспублікі Беларусь у аспекце фарміравання прававой дзяржавы;

- вызначаць сутнасныя характарыстыкі сучаснай беларускай мадэлі прававога развіцця;

- характарызаваць важнейшыя дасягненні прававой культуры беларускага народа;

- тлумачыць праблемныя пытанні гісторыі дзяржавы і права Беларусі і аргументаваць уласныя пазіцыі;

- выкарыстоўваць атрыманыя веды для паспяховага засваення галіновых юрыдычных дысцыплін і фарміравання навуковага светапогляду;

**валодаць:**

- правіламі выбудовы храналогіі этапаў развіцця беларускай дзяржаўнасці;

- навыкамі вызначэння залежнасці змяненняў у прававой сістэме ад гістарычных фактараў і заканамернасцей;

- здольнасцямі ахарактарызаваць месца і ролю суверэннай Беларусі ў сучаснай геапалітычнай сітуацыі ва ўмовах інтэграцыі і глабалізацыі;

- асноўнымі метадамі, спосабамі і сродкамі атрымання, перапрацоўкі гісторыка-прававой інфармацыі;

- навыкамі засваення гісторыка-прававога матэрыялу;

- агульнымі для юрыспрудэнцыі катэгорыямі і паняццямі;

- комплексам навуковых ведаў па гісторыі дзяржавы і права Беларусі.

Асноўнай формай работы студэнтаў з’яўляюцца лекцыі, семінарскія заняткі, напісанне рэфератаў, кантрольных і курсавых работ, тэсціраванне, а таксама самастойнае вывучэнне асобных тэм курса.

Гісторыя дзяржавы і права Беларусі цесна звязана з такімі юрыдычнымі дысцыплінамі, як “Агульная тэорыя права”, “Гісторыя дзяржавы і права замежных краін”, “Гісторыя палітычных і прававых вучэнняў”, “Канстытуцыйнае права”, “Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі” (дысцыпліна кампанента УВА). Спецыяльныя галіновыя юрыдычныя навукі чэрпаюць з гісторыі дзяржавы і права Беларусі пэўныя гістарычныя звесткі, факты, якія дапамагаюць прасачыць эвалюцыю той або іншай дзяржаўна-прававой з’явы, прававога інстытута, маючых глыбокія гістарычныя карані, але разам з тым актуальных і зараз.

Гісторыя дзяржавы і права Беларусі, як адна з фундаментальных юрыдычных дысцыплін, дапамагае будучаму юрысту не толькі стаць сапраўдным прафесіяналам у прававой сферы, але і сфарміраваць уласную грамадзянскую пазіцыю па актуальных пытаннях дзяржаўна-прававога развіцця і ўвогуле – стаць інтэлектуальнай асобай і патрыётам сваёй Айчыны.

На вывучэнне дысцыпліны ў адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам па спецыяльнасці 1-24 01 02 “Правазнаўства” адводзіцца 180 гадзін, у тым ліку 96 аўдыторных гадзін, з іх 62 гадзіны – лекцыі, 34 – семінарскія заняткі; у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам па спецыяльнасці 1-24 01 03 “Эканамічнае права” – 180 гадзін, у тым ліку 96 аўдыторных гадзін, з іх 62 гадзіны

– лекцыі, 34 – семінарскія заняткі; у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам па спецыяльнасці 1-24 01 01 “Міжнароднае права” – 104 гадзіны, у тым ліку 68 аўдыторных гадзін, з іх 52 гадзіны – лекцыі, 16 – семінарскія заняткі.

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

## *1. Для спецыяльнасцей 1-24 01 02 “Правазнаўства”, 1-24 01 03 “Эканамічнае права”*

| №п /п | Назва раздзелаў, тэм | Аўдыторныя гадзіны | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | Лекцыі | Практычныя, семінарскія заняткі |
| **1.** | Тэма 1<br>Прадмет гісторыі дзяржавы і права Беларусі і яго асаблівасці. Гістарыяграфія, перыядызацыя. | 8 | 4 | 4 |
| **2.** | Т э м а 2<br>Грамадска-палітычны лад і права ў Беларусі ў перыяд усталявання дзяржаўнасці ўсходніх славян (IX ст. – першая палова XIII ст.). | 4 | 2 | 2 |
| **3.** | Т э м а 3<br>Беларускія землі ў складзе Вялікага Княства Літоўскага. Грамадскі лад дзяржавы. | 10 | 6 | 4 |
| **4.** | Т э м а 4<br>Дзяржаўна-палітычны лад Вялікага Княства Літоўскага. Уніі з Польшчай. | 8 | 4 | 4 |
| **5.** | Т э м а 5<br>Судовая сістэма Вялікага Княства Літоўскага. Судаводства. | 8 | 6 | 2 |
| **6.** | Т э м а 6<br>Прававая сістэма Вялікага Княства Літоўскага. | 10 | 6 | 4 |
| **7.** | Т э м а 7<br>Грамадска-палітычны лад і права Беларусі ў складзе Рэчы Паспалітай абодвух народаў (XVII–XVIII стст.). | 4 | 4 | - |
| **8.** | Т э м а 8<br>Грамадска-палітычны лад і права Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. | 4 | 4 | - |
| **9.** | Т э м а 9<br>Грамадска-палітычны лад і права Беларусі ў перыяд рэвалюцыйных перамен і адраджэння беларускай дзяржаўнасці (1917 — 1920 гг.). | 10 | 6 | 4 |
| **10.** | Т э м а 10<br>Асаблівасці дзяржаўна-прававога развіцця Беларускай ССР у 20-30-я гады XX ст. | 8 | 4 | 4 |
| **11.** | Т э м а 11<br>Уз’яднанне Заходняй Беларусі з Беларускай ССР у пачатку другой сусветнай вайны. | 2 | 2 | - |
| **12.** | Т э м а 12<br>Беларуская ССР у перыяд Вялікай Айчыннай вайны. | 4 | 2 | 2 |
| **13.** | Т э м а 13<br>Дзяржава і права Беларускай ССР у другой палове 40-х – першай палове 80-х гадоў XX ст. | 8 | 6 | 2 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **14.** | Т э м а 14<br>Дзяржава і права Беларускай ССР на пачатку кардынальных рэформаў у СССР. Абвяшчэнне незалежнасці рэспублікі (другая палова 80-х – пачатак 90-х гг.). | 2 | 2 | - |
| **15.** | Т э м а 15<br>Дзяржава і права Рэспублікі Беларусь у канцы XX – пачатку XXI стст. | 6 | 4 | 2 |
| | Усяго | 96 | 62 | 34 |

## *2. Для спецыяльнасці 1-24 01 01 “Міжнароднае права”*

| №п/п | Назва раздзелаў, тэм | Колькасць гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | Лекцыі | Практычныя, семінарскія заняткі |
| **1.** | Тэма 1<br>Прадмет гісторыі дзяржавы і права Беларусі і яго асаблівасці. Гістарыяграфія, перыядызацыя. | 5 | 4 | 1 |
| **2.** | Т э м а 2<br>Грамадска-палітычны лад і права ў Беларусі ў перыяд усталявання дзяржаўнасці ўсходніх славян (IX ст. – першая палова XIII ст.). | 3 | 2 | 1 |
| **3.** | Т э м а 3<br>Беларускія землі ў складзе Вялікага Княства Літоўскага. Грамадскі лад дзяржавы. | 5 | 4 | 1 |
| **4.** | Т э м а 4<br>Дзяржаўна-палітычны лад Вялікага Княства Літоўскага. Уніі з Польшчай. | 5 | 4 | 1 |
| **5.** | Т э м а 5<br>Судовая сістэма Вялікага Княства Літоўскага. Судаводства. | 8 | 6 | 2 |
| **6.** | Т э м а 6<br>Прававая сістэма Вялікага Княства Літоўскага. | 8 | 6 | 2 |
| **7.** | Т э м а 7<br>Грамадска-палітычны лад і права Беларусі ў складзе Рэчы Паспалітай абодвух народаў (XVII–XVIII стст.). | 2 | 2 | |
| **8.** | Т э м а 8<br>Грамадска-палітычны лад і права Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. | 2 | 2 | |
| **9.** | Т э м а 9<br>Грамадска-палітычны лад і права Беларусі ў перыяд рэвалюцыйных перамен і адраджэння беларускай дзяржаўнасці (1917 — 1920 гг.). | 6 | 4 | 2 |
| **10.** | Т э м а 10<br>Асаблівасці дзяржаўна-прававога развіцця Беларускай ССР у 20-30-я гады XX ст. | 6 | 4 | 1 |
| **11.** | Т э м а 11<br>Уз’яднанне Заходняй Беларусі з Беларускай ССР у пачатку другой сусветнай вайны. | 2 | 2 | |
| **12.** | Т э м а 12<br>Беларуская ССР у перыяд Вялікай Айчыннай вайны. | 4 | 2 | 2 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **13.** | Т э м а 13<br>Дзяржава і права Беларускай ССР у другой палове 40-х – першай палове 80-х гадоў XX ст. | 6 | 4 | 1 |
| **14.** | Т э м а 14<br>Дзяржава і права Беларускай ССР на пачатку кардынальных рэформаў у СССР. Абвяшчэнне незалежнасці рэспублікі (другая палова 80-х – пачатак 90-х гг.). | 2 | 4 | |
| **15.** | Т э м а 15<br>Дзяржава і права Рэспублікі Беларусь у канцы XX – пачатку XXI стст. | 4 | 2 | 2 |
| | Усяго | 68 | 52 | 16 |

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Т э м а 1

### Прадмет гісторыі дзяржавы і права Беларусі і яго асаблівасці. Гістарыяграфія, перыядызацыя

Прадмет і задачы гісторыі дзяржавы і права Беларусі.

Характэрныя рысы, асаблівасці і тэндэнцыі ў развіцці навукі гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Паходжанне назвы “Беларусь”.

Перыядызацыя гісторыі дзяржавы і права Беларусі.

Гістарыяграфія навукі гісторыі дзяржавы і права Беларусі.

### Т э м а 2

### Грамадска-палітычны лад і права ў Беларусі ў перыяд усталявання дзяржаўнасці ўсходніх славян (IX ст. - першая палова XIII ст.)

Зараджэнне дзяржаўнасці ва ўсходніх славян. Пытанне аб узнікненні беларускай дзяржаўнасці. Канцэпцыі паходжання дзяржаўнасці.

Старажытныя беларускія дзяржавы-княствы ў Беларусі (Полацкае, Турава-Пінскае, Берасцейскае, Гарадзенскае, Менскае, Смаленскае і інш.).

Асноўныя рысы і асаблівасці грамадскага ладу. Фарміраванне класаў і сацыяльных груп насельніцтва.

Дзяржаўна-палітычны лад. Сістэма органаў улады і кіравання. Князь і княжацкая ўлада. Службовыя асобы. Веча.

Суд і судаводства.

Хрысціянізацыя насельніцтва. Дзяржава і царква.

Старажытнае права на беларускіх землях. Крыніцы права ў IX-XIII стст. Звычаёвае права: сутнасць, асноўныя рысы. Кананічнае права. Першыя пісаныя помнікі права: Руская Праўда, княжацкія статуты, міждзяржаўныя дагаворы (дагавор 1229 г. з Рыгай і Гоцкім берагам і інш.).

Злачынства і пакаранне.

Станаўленне асноўных інстытутаў грамадзянскага права. Шлюбна-сямейныя адносіны і іх рэгуляванне.

### Т э м а 3

### Беларускія землі ў складзе Вялікага Княства Літоўскага. Грамадскі лад дзяржавы

Асноўныя канцэпцыі паходжання Вялікага Княства Літоўскага.

Знешнія і ўнутраныя, сацыяльна-эканамічныя і палітычныя прычыны і перадумовы ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага.

Працэс фарміравання тэрыторыі дзяржавы з цэнтрам у Навагародку. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Вялікага Княства Літоўскага ў XIV - XVстст. Васальная залежнасць мясцовых (удзельных) князёў ад вялікага князя.

Структура феадальнага грамадства. Падзел на класы і саслоўі. Фарміраванне саслоўя шляхты. Прававое становішча шляхты ў XV-XVI стст. Служылая шляхта і ўбогая шляхта, іх правы і абавязкі.

Сацыяльнае і прававое становішча сялян (гаспадарскіх, панскіх, царкоўных). Прававы статус асобных катэгорый сялян: баяр путных і панцырных, даннікаў, сялян-слуг, цяглых і асадных сялян, агароднікаў, халупнікаў і інш.

Працэс запрыгоньвання сялян і яго адлюстраванне ў заканадаўстве.

Гарадское насельніцтва і яго структурны падзел. Катэгорыя «людзей люзных».

Афармленне прававога становішча гараджан (месцічаў). Правы і абавязкі гараджан вялікакняжацкіх (дзяржаўных) гарадоў і прыватнаўласніцкіх гарадоў. Статус гараджан у гарадах з магдэбургскім правам.

Утварэнне цэхаў і брацтваў. Барацьба гараджан за сацыяльныя і палітычныя правы.

## Т э м а 4

## Дзяржаўна-палітычны лад Вялікага Княства Літоўскага. Уніі з Польшчай

Форма дзяржаўнага ўладкавання і форма кіравання Вялікага Княства Літоўскага. Сістэма органаў дзяржаўнай улады.

Прававое становішча вялікага князя (гаспадара) дзяржавы. Вялікія князі Вялікага Княства Літоўскага (Віцень, Гедзімін, Яўнуцій, Альгерд, Ягайла, Кейстут, Скіргайла, Вітаўт, Свідрыгайла, Жыгімонт, Андрэй Казімір, Аляксандр, Жыгімонт I Стары, Жыгімонт II Аўгуст, Генрых Валуа, Стафан Баторый, Жыгімонт III Ваза) і іх уклад у працэс фарміравання і развіцця дзяржавы.

Рада Вялікага Княства Літоўскага. Яе склад і кампетэнцыя. Змены ў прававым становішчы рады ў XV -XVI стст.

Вышэйшыя службовыя асобы Вялікага Княства Літоўскага (земскія і дворныя): маршалак земскі, канцлер, гетман земскі, падскарбі земскі, іншыя службовыя асобы дзяржавы. Іх прававое становішча і дзейнасць.

Дзяржаўная канцылярыя. Службовыя асобы канцылярыі (пісары, сакратары, дзякі і інш.).

Сойм Вялікага Княства Літоўскага. Працэс станаўлення, склад і парадак дзейнасці. Кампетэнцыя сойма. Заканадаўчая дзейнасць сойма.

Мясцовыя органы дзяржаўнай улады ў перыяд цэнтралізацыі дзяржавы.

Змены ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле. Працэс утварэння ваяводстваў і паветаў. Адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа XVI ст.

Службовыя асобы мясцовай адміністрацыі. Ваяводы. Старасты. Дзяржаўцы. Павятовыя маршалкі. Харужыя. Старцы. Соцкія. Іншыя службовыя асобы.

Ваяводскія і павятовыя соймікі: ўзнікненне і дзейнасць.

Органы ўлады і кіравання ў гарадах. Станаўленне самакіравання ў гарадах з магдэбургскім правам. Прававое становішча войта. Гарадская рада. Бурмістры. Статус лаўнікаў.

Міжнародныя адносіны Вялікага Княства Літоўскага. Міжнародныя сувязі з Лівоніяй, Маскоўскай, Цверскай, Пскоўскай, Наўгародскай і іншымі дзяржавамі. Васальна залежныя ад Вялікага Княства Літоўскага Адаеўскае, Навасільскае, Казельскае і інш. княствы. Міжнародныя пагадненні, саюзы, дагаворы.

Уніі з Польшчай. Крэўская ўнія 1385 г. і Гарадзельская ўнія 1413 г. Уніі ў перыяд княжання Казіміра, Аляксандра, Жыгімонта I Старога.

Дагаворныя адносіны з Лівоніяй і працэс яе далучэння да Вялікага Княства Літоўскага.

Люблінская ўнія 1569 года: прычыны, працэс заключэння, сутнасць, наступствы. Берасцейская царкоўная ўнія 1596 года і яе наступствы.

## Т э м а 5

## Судовая сістэма Вялікага Княства Літоўскага. Судаводства

Судовыя органы Вялікага Княства Літоўскага ў XIV – першай палове XVI стст.

Вышэйшыя (цэнтральныя) суды дзяржавы. Гаспадарскі (Вялікакняжацкі) суд, яго склад, кампетэнцыя і парадак дзейнасці. Суд паноў-рады. Камісарскі суд. Соймавы суд. Падсуднасць спраў.

Судовая рэформа XVI ст. Новыя прынцыпы судовага ладу і судаводства. Утварэнне інстытута адвакатуры. Узнікненне інстытута следчых і судовых выканаўцаў. Возныя і інстыгатары.

Галоўны суд (Трыбунал): узнікненне, парадак фарміравання і дзейнасці. Кампетэнцыя суда. Заканадаўчая рэгламентацыя яго дзейнасці (у законе аб утварэнні суда – «Способ прав трыбунальских» 1581 г., у Статуце 1588 г.)

Мясцовыя суды: замкавы (гродскі), земскі, падкаморскі, каптуровы, копны, войтаўска-лаўніцкі. Перыяд утварэння, склад, парадак фарміравання і дзейнасці. Падсуднасць спраў.

Сялянскія суды. Вотчынны суд феадала над залежнымі людзьмі.

Судова-працэсуальнае права. Змены ў судаводстве ў XVI ст. Судовыя пастановы і судовыя кнігі.

## Т э м а 6

## Прававая сістэма Вялікага Княства Літоўскага

Агульная характарыстыка і асноўныя этапы развіцця прававой сістэмы.

Асноўныя крыніцы права ў перыяд фарміравання Вялікага Княства Літоўскага. Звычаёвае права і абмежаванне яго дзейнасці.

Граматы (прывілеі) – важнейшыя крыніцы права XV – пачатку XVI стст.

Агульназемскія прывілеі: Ягайлы, Гарадзельскія, Гродзенскія, Казіміра, Аляксандра і інш.

Соймавыя пастановы. Пастановы павятовых соймікаў.

Абласныя прывілеі (граматы). Агульная характарыстыка абласных грамат: Віцебскіх 1503, 1509, 1561гг.; Полацкіх 1511, 1547, 1580 гг.; Смаленскай 1505 г.; Бельскіх 1501, 1547 гг.; Драгічынскіх 1511, 1547 гг.; Мсціслаўскай 1551 г. і іншых. Правы і абавязкі насельніцтва па граматах.

Валасныя граматы. Характарыстыка Магілеўскай 1536 г., Свіслацкай 1534 г., Бабруйскіх 1532, 1553 гг., Чачэрскіх 1547, 1554, 1560, 1561 гг., Маркаўскай 1530 г. і іншых валасных грамат. Рэгламентацыя ў граматах правоў і абавязкаў сялян.

Гарадскія граматы на магдэбургскае права. Правы і абавязкі гараджан адпаведна гарадскіх грамат: Брэсту 1390 г., Гродне 1391 г., Полацку 1498 г., Менску 1499 г., Навагрудку 1511 г. і інш.

Спробы кадыфікацыі заканадаўства ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Судзебнік Казіміра 1468 г.

Прычыны і падставы правядзення першай агульнай кадыфікацыі заканадаўства ў Вялікім Княстве Літоўскім. Статут 1529 г.

Рэформа грамадска-палітычнага ладу ў XVI ст. у Вялікім Княстве Літоўскім і адлюстраванне яе ў Статуце 1566 г. Асноўныя палажэнні Статута 1566 г.

Агульная характарыстыка Статута 1588 г. Змены ў канстытуцыйным, грамадзянскім, крымінальным, працэсуальным і іншых галінах права.

Зямельная рэформа XVI ст. Устава на валокі 1557 г.

Воінскія ўставы. Фарміраванне воінскага права.

Праблема выкарыстання субсідыярных крыніц права: рымскага, нямецкага, кананічнага і інш.

Міжнародныя дагаворы – важныя крыніцы права Вялікага Княства Літоўскага XV – XVIII стст.

Працэс фарміравання важнейшых інстытутаў і галінаў феадальнага права ў XIV – XVI стст.

Асноўныя палажэнні галіновага права (канстытуцыйнага, грамадзянскага, адміністрацыйнага, вайсковага, зямельнага, крымінальнага, судова-працэсуальнага і інш.).

Станаўленне канстытуцыйнага заканадаўства ў XVI ст.

Злачынства і пакаранне. Змены ў крымінальным і крымінальна-працэсуальным праве ў XV – XVI стст.

Развіццё асноўных інстытутаў грамадзянскага права ў XV – XVI стст.

Характэрныя асаблівасці і тэндэнцыі ў развіцці апякунскага, шлюбна-сямейнага, залогавага, прыродаахоўчага права ў XVI ст.

Палітыка-прававая думка.

Прававая культура Беларусі XIV-XVI стст.

Юрыдычная адукацыя.

## Т э м а 7

## Грамадска-палітычны лад і права Беларусі ў складзе Рэчы Паспалітай абодвух народаў (XVII–XVIII стст.)

Дзяржаўна-прававое становішча Вялікага Княства Літоўскага ў складзе Рэчы Паспалітай.

Форма дзяржаўнага ўладкавання Рэчы Паспалітай ў XVII – XVIII стст. Вышэйшыя органы дзяржаўнай улады.

Кароль Рэчы Паспалітай, яго прававое становішча і паўнамоцтвы. «Генрыкавы артыкулы» і «Пакта канвента».

Сойм Рэчы Паспалітай. Яго склад і парадак дзейнасці. Сенат Рэчы Паспалітай. Пасольская ізба.

Соймавыя пастановы.

Павятовыя соймікі, іх дзейнасць і пастановы.

Спробы правядзення рэформаў дзяржаўнага ладу ў сярэдзіне XVIII ст. Змены ў дзейнасці сойма і павятовых соймікаў. Утварэнне скарбавай і вайсковай камісій. Заснаванне адукацыйнай камісіі.

Пастаянная Рада і яе дэпартаменты.

Слуцкая і Барская канфедэрацыі. Прыняцце закона аб ураўненні ў правах праваслаўных і пратэстантаў з каталікамі.

Першы падзел Рэчы Паспалітай.

Заканадаўчая дзейнасць Чатырохгадовага сойма Рэчы Паспалітай. Новыя тэндэнцыі ў развіцці права.

Канстытуцыя («Закон аб урадзе») Рэчы Паспалітай 1791 года. Змены ў дзяржаўным ладзе і ў сістэме вышэйшых органаў улады. Утварэнне і склад «Аховы законаў» Рэчы Паспалітай. Вялікія камісіі: паліцыі, войска, скарбу, адукацыі.

Таргавіцкая канфедэрацыя і замежная інтэрвенцыя. Другі падзел Рэчы Паспалітай. Гродзенскі сойм і яго Канстытуцыя. Паўстанне 1794 г. пад кіраўніцтвам А.Т. Касцюшкі. Органы паўстання. Паланецкі ўніверсал.

Трэці падзел Рэчы Паспалітай. Далучэнне Беларусі да Расійскай імперыі.

Крыніцы права Рэчы Паспалітай абодвух народаў. Новыя выданні Статута 1588 г. Кардынальныя правы 1768, 1775, 1791 гадоў. Заканадаўства Чатырохгадовага сойма.

Volumina legum. Праекты новых законаў.

Развіццё гарадскога права.

Міжнародныя дагаворы Рэчы Паспалітай з Швецыяй, Турцыяй, Расіяй і інш.

Змены ў судовым ладзе Вялікага Княства Літоўскага ў XVII–XVIII стст.

Развіццё грамадска-палітычных і прававых ідэй у Беларусі ў XVII–XVIII стст.

Юрыдычная адукацыя. Юрыдычны факультэт Віленскай акадэміі.

## Т э м а 8

## Грамадска-палітычны лад і права Беларусі ў складзе Расійскай імперыі

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі ў першай палавіне XIX ст. Тыльзіцкі мірны дагавор 1807 г. і далучэнне Беластоцкай акругі да Расійскай імперыі.

Праекты аднаўлення Вялікага Княства Літоўскага (1811 г. і інш.).

Грамадска-палітычны лад. Змены ў сацыяльнай структуры насельніцтва.

Органы расійскага мясцовага кіравання на тэрыторыі Беларусі. Генерал-губернатар, яго паўнамоцтвы. Губернатар і губернскае праўленне. Казённая палата і іншыя губернскія ўстановы. Павятовыя органы дзяржаўнага кіравання.

Губернскія і павятовыя дваранскія (шляхецкія) сходы як органы саслоўнага самакіравання.

Судовыя ўстановы ў беларускіх губернях і паветах.

Полацкі царкоўны сабор і ліквідацыя ўніяцкай царквы ў Беларусі.

Палітычныя і прававыя ідэі ў Беларусі ў XIX ст. Віленскі ўніверсітэт. Філаматы і філарэты.

Права. Кадыфікацыя мясцовага права. Праект зводу законаў заходніх губерняў. Увядзенне ў дзеянне законаў Расійскай імперыі. Адмена дзеяння Статута 1588 г.

Сацыяльна-эканамічная і палітычная сітуацыя ў Беларусі ў сярэдзіне XIX ст. Скасаванне прыгоннага права. Маніфест ад 19 лютага 1861 г. Агульнае Палажэнне аб сялянах, якія выйшлі з прыгоннай залежнасці. Палажэнне аб губернскіх і павятовых установах па сялянскіх справах. Мясцовыя палажэнні. Асаблівасці сялянскай рэформы ў Беларусі. Прававое становішча сялян пасля рэформы.

Рэформа мясцовых органаў. Міравыя пасрэднікі. Сялянскія сходы. Валаснoе праўленне. Валасны суд.

Судовая рэформа 1864 г. і яе асаблівасці ў Беларусі. Міравыя суды. Агульныя суды: акруговыя суды, судовыя палаты. Сенат. Інстытут прысяжных павераных.

Рэарганізацыя гарадскіх органаў кіравання ў 1870 г. і 1892 г.

Земская рэформа і асаблівасці яе правядзення ў Беларусі. Земскія сходы і іх управы.

Ваенная і іншыя рэформы. Контррэформы.

Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух у Беларусі ў пачатку ХХ ст. Царскі Маніфест ад 6 жніўня 1905 г. аб утварэнні Дзяржаўнай Думы Расіі. Іншыя законы. Маніфест ад 17 кастрычніка 1905 г. «Аб удасканаленні дзяржаўнага парадку». Канстытуцыйны характар «Звода асноўных дзяржаўных законаў» (красавік 1906 г.). Дзяржаўны Савет і яго дзейнасць.

Сталыпінская аграрная рэформа.

Беларусь падчас першай сусветнай вайны. Дзейнасць земстваў у Беларусі.

Развіццё права ў канцы ХІХ – пачатку ХХ стст. Змены ў цывільным, крымінальным і працэсуальным праве. Крымінальнае Ўлажэнне 1903 г.

Актывізацыя нацыянальна-вызваленчага руху ў пачатку ХХ ст.

## Т э м а 9

## Грамадска-палітычны лад і права Беларусі ў перыяд рэвалюцыйных перамен і адраджэння беларускай дзяржаўнасці (1917 –- 1920 гг.)

Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. у Расіі. Актывізацыя нацыянальна-вызваленчага руху. Троеўладдзе ў Беларусі. З’езд беларускіх нацыянальных арганізацый 25 - 27 сакавіка 1917 г. у Мінску.

Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. у Расіі. Усталяванне Савецкай улады на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі. Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і фронта, яго Прэзідыум і Савет Народных Камісараў.

Усебеларускі з’езд (кангрэс) у Мінску ў снежні 1917 г. Рада Усебеларускага з’езда і яе выканаўчы камітэт. Народны Сакратарыят Беларусі.

Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі. Устаўныя граматы. Першы ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі, яго дзейнасць.

Брэсцкі (Брэст-Літоўскі) мірны дагавор і яго гісторыка-прававая характарыстыка.

Першы з’езд Кампартыі Беларусі ў снежні 1918 г. у Смаленску і яго рашэнні. Працэдура фарміравання і склад першага Часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларускай ССР. Яго кампетэнцыя і дзейнасць.

Маніфест Часовага рабоча-сялянскага ўраду Беларусі аб утварэнні Беларускай ССР ад 1 студзеня 1919 г.

Тэрыторыя Беларускай ССР, адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел.

Першы з’езд Саветаў Беларусі 2-3 лютага 1919 г. і яго рашэнні. Змяншэнне тэрыторыі БССР. Дэкларацыі з'езда Саветаў.

Першая Канстытуцыя Беларускай ССР 1919 г.

Утварэнне Літоўска-Беларускай савецкай рэспублікі і яе дзейнасць.

Аднаўленне Беларускай ССР. Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці ад 31 ліпеня 1920 г., яе важнейшыя палажэнні і значэнне.

Ваенна-рэвалюцыйны камітэт БССР і яго дзейнасць.

Другі з’езд Саветаў Беларускай ССР (снежань 1920 г.). Прынясце Дапаўненняў да Канстытуцыі БССР 1919 г. Утварэнне СНК БССР.

Рыжскі мірны дагавор 1921 г. паміж Расіяй і Польшчай. Падзел тэрыторыі Беларусі.

## Т э м а 10

## Асаблівасці дзяржаўна-прававога развіцця Беларускай ССР у 20-30-я гады XX ст.

Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча Беларускай ССР пасля заканчэння грамадзянскай вайны. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел.

Станаўленне сістэмы савецкіх органаў улады ў Беларускай ССР. З'езды Саветаў БССР. Заканадаўчая дзейнасць ЦВК і СНК БССР. Мясцовыя Саветы і іх выканкамы.

Пераход да новай эканамічнай палітыкі і яго нарматыўнае рэгуляванне. Дзейнасць вышэйшых і мясцовых органаў савецкай улады БССР у 20-я гады.

Узаемаадносіны БССР з РСФСР да 1923 г. Саюзны рабоча-сялянскі дагавор 1921 г.

Уваходжанне БССР у склад Саюза ССР. Саюзны дагавор 1922 г. Канстытуцыя СССР 1924 г.

Вяртанне ў склад БССР усходніх раёнаў Беларусі ў 1924, 1926 гг. Увядзенне новага (акруговага) адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу.

Палітыка нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў БССР, яе асноўныя накірункі і вынікі.

Судовы лад БССР. Пракуратура. Народны камісарыят унутраных спраў БССР.

Тэндэцыі і асаблівасці ў развіцці заканадаўства Беларускай ССР. Увядзенне ў дзеянне кодэксаў і іншых нарматыўных актаў РСФСР. Уласная кадыфікацыя заканадаўства.

Канстытуцыя Беларускай ССР 1927 г.

Станаўленне адміністрацыйна-каманднай сістэмы кіравання. Вышэйшыя і мясцовыя органы савецкай улады ў БССР у 30-я г. Падпарадкаванне дзейнасці дзяржаўнага апарата партыйным камітэтам Камуністычнай партыі.

Калектывізацыя сельскай гаспадаркі і яе вынікі. Дырэктывы XV з’езда УКП(б). Машынна-трактарныя станцыі і іх палітаддзелы як органы кіравання калгасамі.

Рэарганізацыя кіраўніцтва прамысловасцю. Пяцігадовыя планы развіцця эканомікі.

Фарміраванне рэпрэсіўнага дзяржаўнага апарата ў СССР. Парушэнне законнасці і палітычныя рэпрэсіі ў Беларусі.

Канстытуцыя СССР 1936 г. і Канстытуцыя БССР 1937 г. Змены ў сістэме савецкіх органаў улады і кіравання. Утварэнне Вярхоўнага Савета БССР і яго Прэзідыўма.

Увядзенне абласнога адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу.

Судовая сістэма БССР і змены ў ёй. Народныя суды. Акруговыя суды. Вярхоўны суд. Іншыя судовыя ўстановы. Пазасудовыя рэпрэсіўныя органы.

Палажэнне аб судовым ладзе СССР, саюзных і аўтаномных рэспублік ад 16 жніўня 1938 г.

Негатыўныя тэндэнцыі ў развіцці савецкага права. Змены ў крымінальным і крымінальна-працэсуальным заканадаўстве.

## Т э м а 11

## Уз’яднанне Заходняй Беларусі з Беларускай ССР у пачатку другой сусветнай вайны

Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы (ІІ-й Рэчы Паспалітай). Польскі дзяржаўны паліцэйска-бюракратычны рэжым на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1920-1939 гг.). Дзейнасць вышэйшых і мясцовых органаў дзяржаўнай улады Польшчы адносна Заходняй Беларусі. Права ІІ-й Рэчы Паспалітай. Канстытуцыі Рэчы Паспалітай 1921, 1935 гг. Тэндэнцыі ў развіцці заканадаўства (крымінальнага, грамадзянскага і інш.).

Прававое становішча насельніцтва Заходняй Беларусі. Нацыянальна-вызваленчая барацьба беларускага народа Заходняй Беларусі ў 20–30-я гг.

Савецка-германскія пагадненні ў канцы 30-х гг. Дагавор паміж СССР і Германіяй 1939 г.

Гітлераўская агрэсія супраць Польшчы і пачатак другой сусветнай вайны ў верасні 1939 г. Уступленне Чырвонай Арміі на тэрыторыю Заходняй Беларусі.

Адарванне ад Беларусі Віленскага краю і перадача яго Літоўскай рэспубліцы ў 1939 г.

Утварэнне часовых органаў улады ў Заходняй Беларусі. Іх склад і дзейнасць. Народны (Нацыянальны) сход Заходняй Беларусі і яго рашэнні. Дэкларацыі Народнага (Нацыянальнага) сходу.

Прыняцце Заходняй Беларусі ў 1939 г. у склад СССР і БССР.

Утварэнне абласцей, раёнаў і сельсаветаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Фарміраванне органаў савецкай улады ў заходніх абласцях Беларускай ССР.

## Т э м а 12

## Беларуская ССР у перыяд Вялікай Айчыннай вайны

Вераломны напад гітлераўскай Германіі на Савецкі Саюз. Прычыны няўдач Чырвонай Арміі ў першыя месяцы вайны.

Утварэнне Дзяржаўнага Камітэта Абароны СССР і іншых надзвычайных савецкіх органаў на перыяд вайны.

Асаблівасці ў праве ваеннага перыяду. Змены ў крымінальным, крымінальна-працэсуальным, працоўным, грамадзянскім, шлюбна-сямейным заканадаўстве.

Дзяржаўныя органы БССР і іх дзейнасць у перыяд вайны.

Нямецкі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі.

Усенародная партызанская барацьба беларускага народа супраць нямецкіх акупантаў. Партызанскія і партыйныя органы ў Беларусі: іх функцыі, паўнамоцтвы і дзейнасць.

Пачатак вызвалення Беларусі ад гітлераўскіх акупантаў. Асаблівасці аднаўлення і дзейнасці савецкіх органаў дзяржаўнай улады, партыйных органаў у вызваленых раёнах Беларусі.

Аднаўленне народнай гаспадаркі рэспублікі і яго нарматыўнае рэгуляванне.

Тэрытарыяльныя страты Беларускай ССР.

## Т э м а 13

## Дзяржава і права БССР у другой палове 40-х – першай палове 80-х гг. XX ст.

Змены ў міжнароднай дзейнасці савецкіх рэспублік. Утварэнне Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Удзел Беларускай ССР у ААН.

Дзейнасць органаў дзяржаўнай улады БССР у першыя пасляваенныя гады. Вярхоўны Савет БССР і Прэзідыум Вярхоўнага Савета.

Пераўтварэнне Савета Народных Камісараў у Савет Міністраў рэспублікі. Кампетэнцыя і накірункі дзейнасці ўрада БССР.

Асаблівасці дзейнасці мясцовых органаў дзяржаўнай улады і кіравання ў пасляваенны перыяд.

Адбудова народнай гаспадаркі БССР. Першая пасляваенная пяцігодка развіцця народнай гаспадаркі.

Калектывізацыя сялянскіх гаспадарак у заходніх абласцях Беларускай ССР.

Партыйныя камітэты УКП(б)–КПСС і іх роля ў дзяржаўным кіраванні.

Дзейнасць органаў міліцыі, пракуратуры і суда.

Змены ў заканадаўстве СССР і БССР у другой палове 40-х – сярэдзіне 50-х гг.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел БССР і змены ў ім.

XX з’езд КПСС 1956 г. і яго рашэнні. Спробы правядзення дзяржаўных рэформаў і пашырэння кампетэнцыі савецкіх рэспублік.

Дзейнасць вышэйшых органаў дзяржаўнай улады і кіравання ў СССР і БССР у 50-80-я гг.

Змены ў кіраванні сельскай гаспадаркай і прамысловасцю. Утварэнне і ліквідацыя Саўнаргаса БССР.

Актывізацыя праватворчай дзейнасці рэспублікі. Новыя тэндэнцыі ў праве.

Кадыфікацыя заканадаўства. Прыняцце КК і КПК 1960 г., ГК і ГПК 1964 г. Шлюбна-сямейны кодэкс БССР 1969 г. Зямельны кодэкс БССР 1970 г. Водны кодэкс і Кодэкс законаў аб працы БССР 1972 г. Лясны кодэкс БССР 1979 г. Жыллёвы кодэкс БССР 1983 г. Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях БССР 1984 г.

Новыя ініцыятывы СССР у сферы міжнародных адносін. Актывізацыя міжнароднай дзейнасці і пашырэнне міжнародных сувязяў Беларускай ССР.

Змены ў дзейнасці суда, пракуратуры, праваахоўчых органаў БССР.

Вышэйшыя і мясцовыя органы дзяржаўнай улады і кіравання БССР у другой палове 60-х – першай палове 80-х гадоў. Вярхоўны Савет БССР і яго Прэзідыум. Савет Міністраў БССР. Міністэрствы і камітэты.

Новае заканадаўства аб мясцовых Саветах і іх выканкамах.

Нарастанне застойных з'яў у грамадска-палітычным жыцці савецкіх рэспублік з другой паловы 70-х гг.

Прыняцце Канстытуцыі СССР 1977 г. Канстытуцыя Беларускай ССР 1978 г.

Асаблівасці ў развіцці права. Змены ў заканадаўстве БССР пасля прыняцця Канстытуцыі.

Удасканаленне судовай сістэмы БССР. Змены ў заканадаўстве і дзейнасці суда, пракуратуры, праваахоўчых органах БССР.

## Т э м а 14

## Дзяржава і права Беларускай ССР на пачатку кардынальных рэформаў у СССР. Абвяшчэнне незалежнасці рэспублікі (другая палова 80-х – пачатак 90-х гг.)

Пачатак рэфармавання і дэмакратызацыі грамадскіх адносін у СССР. Змены ў заканадаўстве СССР і БССР. Змены ў Канстытуцыі БССР 1978 года.

Дзейнасць вышэйшых органаў улады СССР і БССР у 1985–1990 гг. Вярхоўны Савет БССР. Яго камісіі. Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР. Савет Міністраў БССР.

Распад Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Абвяшчэнне незалежнасці Беларускай ССР. Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР 1990 г. і яе значэнне. Змены ў сістэме органаў улады Беларусі і заканадаўстве.

Утварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Узаемаадносіны рэспублік у межах СНД. Актывізацыя працэсу дэмакратызацыі грамадскіх адносін і пераходу да рынкавых адносін.

Новыя тэндэнцыі ў праве. Змены ў заканадаўстве.

## Т э м а 15

## Дзяржава і права Рэспублікі Беларусь у канцы XX – пачатку XXI стст.

Станаўленне суверэннай сістэмы органаў дзяржаўнай улады і мясцовага самакіравання ў Рэспубліцы Беларусь. Судова-прававая рэформа ў Рэспубліцы Беларусь.

Актывізацыя грамадска-палітычнай думкі.

Узнікненне новых палітычных партый у Рэспубліцы Беларусь.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 года. Змены ў сістэме органаў улады. Развіццё заканадаўства.

Змяненні і дапаўненні да Канстытуцыі, прынятыя 24 лістапада 1996 года.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь і яго паўнамоцтвы.

Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь.

Канстытуцыйны суд: стварэнне і дзейнасць.

Пракуратура Рэспублікі Беларусь.

Рэспубліканскія рэферэндумы.

Развіццё права. Кадыфікацыя заканадаўства.

Новыя тэндэнцыі ў міжнародных адносінах. Пашырэнне міжнародных сувязяў Рэспублікі Беларусь. Міжнародныя пагадненні. Саюз Беларусі і Расіі. Статут Саюза Расіі і Беларусі 1997 г. Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі ад 8 снежня 1999 г.

Асаблівасці ў развіцці галіновага заканадаўства: канстытуцыйнага, грамадзянскага, экалагічнага, працоўнага, крымінальнага і інш. Прыняцце новых кодэксаў Рэспублікі Беларусь.

Асаблівасці і тэндэнцыі ў развіцці прававой думкі, юрыдычнай навукі і юрыдычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Асноўная літаратура

### Да ўсяго курса


1. Асветнікі зямлі Беларускай: энцыкл. даведнік / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 2001. – 496 с.
2. Бардах, Ю. История государства и права Польши / Ю. Бардах, Б. Леснодорский, М. Пиетрчак. – М.: Юрид. лит., 1980. – 559 с.
3. Бардах, Ю. Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага / Ю. Бардах. – Мінск: Медысонт, 2010. – 456 с.
4. Брянцев, П. Д. История Литовского государства с древнейших времен / П.Д. Брянцев. – Вильна: Типография А.Г. Сыркина, 1889. – 659с.
5. Васілевіч, Р. А. Гісторыя канстытуцыйнага права Беларусі / Р.А. Васілевіч, Т.І. Доўнар, І.А. Юхо. – Мінск: ВТАА "Права і эканоміка", 2001. – 363 с.
6. Вішнеўская, І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / І.У. Вішнеўская. – Мінск: Тэсей, 2004. – 271 с.
7. Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / А.Ф. Вішнеўскі. – Мінск: Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь, 2003. – 319 с.
8. Вішнеўскі, А.Ф. Палітыка-прававы рэжым савецкай дзяржавы (1917-1953 гг.) / А.Ф. Вішнеўскі. – Мінск: Тэсей, 2002. – 224 с.
9. Вишневский, А.Ф. Очерки истории государства и права Республики Беларусь (1917 – 1995 гг.) / А.Ф. Вишневский. – Минск: ТПА "Форум", 1995. – 272 с.
10. Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах (са старажытных часоў да нашых дзен) / А.Ф. Вішнеўскі, Я.А. Юхо; пад агульн. рэд. праф. А.Ф. Вішнеўскага. – Мінск: Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь, 2003. – 320 с.
11. Вялікае княства Літоўскае: у 2 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]– Мінск: БелЭН, 2005 – 2006.
12. Владимирский-Буданов, М.Ф. Очерки из истории литовско-русского права / М.Ф. Владимирский-Буданов. – Киев: Типография В.И. Заводского, 1893. – 320 с.
13. Владимирский-Буданов, М.Ф. Обзор истории русского права / М.Ф. Владимирский-Буданов. – Киев: Издание книгопродавца Н.Я. Оглоблина, 1915. – 667 с.
14. Гісторыя і сучаснасць: беларуская дзяржаўнасць ва ўсходнееўрапейскім кантэксце: зборнік навуковых прац, прысвечаных 90-годдзю з дня нараджэння прафесара І.А. Юхо / рэдкал.: С.А. Балашэнка (гал. рэд.) і [інш.]. – Мінск: Бизнесофсет, 2012. – 552 с.
15. Дзербіна, Г.У. Права і сям'я ў Беларусі эпохі Рэнесансу / Г.У. Дзербіна. – Мінск: Тэхналогія, 1997. – 174с.
16. Доўнар, Т.І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / Т.І. Доўнар. – Мінск: ДІКСТ БДУ, 2011. – 552 с.
